Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

# РАЗВИТИЕ ФУНДАМЕНТАЛЬНОЙ НАУКИ В БГПУ

*Материалы*
*научно-практической конференции*

*г. Минск, 19 ноября 2015 г.*

Минск 2016

УДК 37.01
ББК 74.58
Р 17

Печатается по решению редакционно-издательского совета БГПУ

Рецензенты:
*А. В. Торхова*, доктор педагогических наук, профессор, проректор по научной работе БГПУ;
*П. А. Матюш*, кандидат исторических наук, доцент, заведующий научно-исследовательским сектором БГПУ

Р17 **Развитие** фундаментальной науки в БГПУ : материалы науч.-практ. конф., г. Минск, 19 ноября 2015 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка. – Минск : БГПУ, 2016. – 300 с.

ISBN 978-985-541-232-9.

В сборнике представлены статьи, отражающие основные результаты исследований в рамках заданий по Государственным программам научных исследований на 2011–2015 гг.

This book contains articles that reflect the main results of research in the framework of tasks of the State scientific research programs for 2011–2015.

УДК 37.01
ББК 74.58

ISBN 978-985-541-232-9

© БГПУ, 2016

Научное издание

# РАЗВИТИЕ ФУНДАМЕНТАЛЬНОЙ НАУКИ В БГПУ

*Материалы научно-практической конференции*

*г. Минск, 19 ноября 2015 г.*

*Корректоры* О. П. Андриевич, Н. И. Смолич, О. В. Юхновец
*Компьютерная верстка* А. А. Покало
*Дизайн обложки* А. А. Покало

Подписано в печать 08.04.16. Формат 60x84 1/16. Бумага офсетная. Гарнитура *Таймс*. Печать Riso. Усл. печ. л. 17,44. Уч.-изд. л. 17,24. Тираж 70 экз. Заказ 229.

*Издатель и полиграфическое исполнение:*
*Учреждение образования* «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка».
Свидетельство о государственной регистрации издателя печатных изданий № 1/236 от 24.03.14.
ЛП № 02330/448 от 18.12.13.
Ул. Советская, 18, 220030, Минск.
http://bspu.by/upravleniya-i-podrazdeleniya/uchebno-izdatelskii-centr

*УДК 930.2(476)«17/18»*

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

# SOCIAL AND ECONOMIC PRECONDITIONS FOR FORMATION OF THE BELARUSIAN NATION IN THE LATE XVIII – FIRST HALF OF THE XIX CENTURY

*А. М. Люты* / *M. Lyuty*

У артыкуле аналізуюцца сацыяльна-эканамічныя перадумовы фарміравання беларускай нацыі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Гэты працэс цесна звязаны з развіццём буржуазных адносін. Аднак марудныя тэмпы зараджэння і развіцця капіталізму ў эканоміцы Беларусі вызначылі і характар новай сацыяльнай структуры і перадумовы фарміравання класаў буржуазнага грамадства. У разглядаемы перыяд працэс фарміравання беларускай нацыі працягваўся як сялянскай, што вызначалася слабасцю і малаколькаснасцю нацыянальнай буржуазіі.

The article analyzes the socio-economic preconditions of forming Belarusian nation at the end of XVIII – the first half of XIX century. This process is closely related with the development of bourgeois relations. However, slow pace of nucleation and development of capitalism in the Belarusian economy and determined the character of new social structure and preconditions of forming classes of bourgeois society. During this period, the formation process of the Belarusian nation lasted as a peasant in its basis, that is determined, first of all, the weakness and the paucity of the national bourgeoisie.

Працэс фарміравання беларускай нацыі мае шматлікія перадумовы сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, нацыянальна-канфесійнага характару. Гэты працэс цесна звязаны з фарміраваннем буржуазнага грамадства і класа буржуазіі.

Сацыяльна-эканамічны і палітычны крызіс Рэчы Паспалітай, у склад якой уваходзіла Беларусь, абумоўлены распаўсюджваннем фальваркава-паншчыннай сістэмы, эканамічнымі прывілеямі шляхты, панаваннем магнатаў, шматлікімі войнамі і палітычным ладам дзяржавы, вызначыў нізкія тэмпы гаспадарчага развіцця краю ў даследуемы перыяд.

У канцы XVIII ст. беларускія губерні былі ўцягнуты ў агульнарасійскі рынак і ўсё цясней звязваліся з іншымі эканамічнымі раёнамі Расіі. Былі створаны перадумовы для больш хуткага развіцця транспарту, росту колькасці гарадоў і гарадскога насельніцтва, першапачатковага накаплення капіталу, неабходнага для развіцця гандлю і прамысловасці. Некалькі палепшылася ў першыя гады пасля далучэння Беларусі да Расіі становішча насельніцтва. Павялічыліся пасяўныя плошчы, было аслаблена самавольства памешчыкаў і арандатараў казённых маёнткаў, падаткавае насельніцтва было вызвалена ў першыя гады ад аплаты дзяржаўных падаткаў, зменшаны



падаткі на шэраг гадоў у 1,5–2 разы [1]. Станоўчы ўплыў на развіццё гандлю паміж беларускімі губернямі, расійскімі і Украінай аказала ліквідацыя ўнутраных мытняў і застаў, адмена шматлікіх пошлін [2], якія браліся асобнымі гарадамі, манастырамі і буйнымі феадаламі,увядзенне ў заходніх губернях агульнарасійскай сістэмы мер вагі [3] і адзінай фінансавай сістэмы [4]. Былі заснаваны пошты. Аднак узмацненне феадальнага, а затым нацыянальнага прыгнёту, ваенныя дзеянні ў перыяд вайны 1812 г. і іх вынікі, імкненне Расіі пераўтварыць заходнія губерні ў сыравінны прыдатак стрымлівалі эканамічнае развіццё краю.

Канец XVIII – першая палова XIX ст. – гэта перыяд паступовага стварэння ўмоў для генезісу новых буржуазных адносін, якія, нягледзячы на шэраг стрымліваючых фактараў, абумовілі напрамак сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі.

Асноўнай галіной эканомікі Беларусі на працягу даследуемага перыяду заставалася сельская гаспадарка. Развал апарату дзяржаўнай улады Рэчы Паспалітай, міжусобная барацьба магнацкіх груповак за ўладу, ваенныя сутыкненні і войны адмоўна паўплывалі на развіццё сельскай гаспадаркі. З прычыны войнаў урад быў вымушаны за даўгі перадаваць магнатам у пастаяннае карыстанне землі з дзяржаўнага фонду. У выніку раздачы дзяржаўных зямель і скупкі ўчасткаў у збяднелай шляхты ва ўласнасць асобных магнатаў перайшлі цэлыя паветы. Магнаты ў канцы XVIII ст. былі ўладальнікамі не толькі вёсак, але і шматлікіх гарадоў і мястэчак.

У залежнасці ад маёмаснага становішча змянілася і структура памешчыцкай зямельнай уласнасці: памяншаецца доля дробных і нязначна павялічваецца ўдзельная вага сярэдніх уладанняў, значна памяншаецца колькасць і ўдзельная вага буйных зямельных уладанняў (ад 500 да 1000 душ) і некалькі павялічылася доля буйнейшых магнацкіх уладанняў (больш за 1000 сялян) [5].

Іншымі словамі, па-ранейшаму захоўвалася непахіснасць феадальна-прыгонніцкага спосабу вытворчасці, асновай якога была, як вядома, феадальная зямельная ўласнасць, дзе працавалі прыгонныя і феадальна залежныя сяляне. Рост буйнога магнацкага землеўладання стрымліваў фарміраванне перадумоў капіталізму ў сельскай гаспадарцы, захоўваў старыя феадальныя эканамічныя адносіны.

У параўнанні з канцом XVIII ст., у першай палове XIX ст. прасочваецца тэндэнцыя скарачэння ўдзельнай вагі багатых сялянскіх гаспадарак, хоць колькасць і ўдзельная вага бедных гаспадарак амаль не змянілася. Частка буйных землеўладальнікаў Беларусі стала арыентавацца на рынак. Гэтаму садзейнічалі як рост цэн на хлеб на знешнім рынку, так і рост колькасці гарадскога насельніцтва ў заходніх губернях.

Развіццё таварнай гаспадаркі пры дапамозе памешчыцкага прадпрымальніцтва не стварала перадумоў для зараджэння буржуазных адносін у сельскай гаспадарцы і срымлівала іх фарміраванне ў гандлі і прамысловасці.

У вывучаемы перыяд была характэрна ўстойлівасць дамашніх промыслаў і выпадковая, эпізадычная іх сувязь з рынкам, што тлумачыцца захаваннем натуральнага характару сялянскіх гаспадарак у дарэформенны перыяд.

Адзначым, што промысел быў непарыўна звязаны з сялянскай гаспадаркай і з'яўляўся падсобным заняткам да земляробства, насіў, за невялікім выключэннем, сезонны характар. Распаўсюджванне і развіццё фальваркова-паншчыннай сістэмы гаспадаркі стрымлівала і рост адыходных промыслаў. Часовы ж адыход сялян на будаўніцтва дарог, высечку і сплаў лесу, заняткі возніцтвам нельга аднесці да адыходных промыслаў як зыходнай формы таварнай вытворчасці.

Калі хатнія і адыходныя промыслы ў вывучаемы перыяд больш характэрны для вёскі, то рамяство стала састаўной часткай эканамічнага жыцця горада. Сельскія рамеснікі былі пазбаўлены гаспадарчай самастойнасці і сувязі з рынкам. Манаполія феадалаў на вытворчасць і рэалізацыю рамесных вырабаў у вёсках, прыватнаўласніцкіх мястэчках і гарадах тармазіла развіццё прамысловасці.

У пачатку XIX ст. у сувязі з ростам гарадоў і ажыўленнем гандлю стала больш хуткімі тэмпамі развівацца гарадское рамяство. Частка рамеснай прадукцыі ішла на рынак і рамяство паступова перарастала ў дробную таварную вытворчасць. Большасць дробных капіталістычных прадпрыемстваў і мануфактур вырасла ў вывучаемы перыяд не з рамесных майстэрняў непасрэдна, а была арганізавана купцамі або мяшчанамі. Рамесная вытворчасць з'яўлялася базай для развіцця капіталістычнай прамысловасці хутчэй як школа падрыхтоўкі кваліфікаваных наёмных рабочых.

З 1750 па 1774 г. у Беларусі налічвалася 31 прамысловае прадпрыемства і толькі на адным з іх працавала 5 вольнанаёмных рабочых. У канцы XVIII ст. са 152 прадпрыемстваў праца вольнанаёмных пераважала на 56 (галоўным чынам дробных гарадскіх) прадпрыемстваў. У першай трэці XIX ст. такіх прадпрыемстваў налічвалася ўжо 192 (з 345), а ў другой трэці – 259 (з 643) [6]. Неабходна адзначыць, што большасць з іх былі дробнымі і недаўгавечнымі, знаходзіліся часцей за ўсё ў гарадах, дзе да адмены прыгоннага права панавала рамяство. Асноўная прычына больш інтэнсіўнага развіцця рамяства і параўнальна слабае развіццё буйной прамысловасці – гэта амаль поўная адсутнасць важнейшай умовы, неабходнай для развіцця буйной прамысловасці – значныя капіталы ў купцоў і мяшчан. Такое становішча можна растлумачыць складанасцю і асаблівасцю сацыяльна-эканамічных і палітычных умоў у папярэдні час: панаванне магнатаў і шляхты ў эканамічным жыцці рэгіёну, наяўнасць вялікай колькасці прыватнаўласніцкіх гарадоў і мястэчак; права прапінацыі для памешчыкаў, якое захавалася і ў XIX ст.; канкурэнцыя рускіх купцоў і прамыслоўцаў; частыя ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў XVIII – пачатку XIX ст., звязаныя з імі разбурэнні і заняпад гаспадарчага жыцця і інш. Гэтыя ўмовы прадвызначылі інтэнсіўнасць і тэмпы першапачатковага накаплення капіталаў, прамысловае развіццё ў Беларусі, а таксама перамогу вотчыннай прамысловасці ў канкурэнтнай барацьбе з капіталістычнай. З 643 прадпрыемстваў напярэдадні адмены прыгоннага права 382 (59,4 %) належала дваранам [7]. Гэта тлумачылася не толькі тым, што дваране выкарыстоўвалі манапольнае права ўласнасці на зямлю, сыравіну і бясплатную працу прыгонных сялян, але і тым, што патэнцыяльныя ўладальнікі купецкіх прадпрыемстваў былі на 90 % прадстаўнікамі яўрэйскай нацыянальнасці, а ім забаранялася адкрываць прамысловыя ўстановы ў сельскай мясцовасці і жыць па-за гарадамі і мястэчкамі, а таксама выязджаць за «межы яўрэйскай аселасці» без спецыяльнага дазволу. Двайны падаткавы прыгнёт і абмежаванні ў атрыманні пазыкі таксама стрымлівалі развіццё купецкага прадпрымальніцтва. Не выпадкова, што беларускія губерні па ўзроўні развіцця прамысловасці, займалі апошнія месцы ў Расійскай імперыі.

Немалаважнае значэнне мела і палітыка рускага самадзяржаўя ў Беларусі, накіраваная на абмежаванне развіцця мясцовай прамысловасці і пераўтварэння рэгіёну ў свой сыравінны аграрны дадатак.

Стрымлівала развіццё прамысловасці і вузкасць унутранага рынку, які адлюстроўваў агульны стан эканомікі рэгіёну. Ва ўмовах развіцця таварна-грашовых адносін царскі ўрад не адмовіўся ад саслоўнага прынцыпу арганізацыі гандлю. Дазвол дваранству на рознічны і аптовы гандаль, зняцце абмежаванняў у дачыненні гандлю сялян і мяшчан станоўча адбіліся б на развіцці гандлю, калі б не тыя абмежаванні, якія фактычна не давалі магчымасці сялянам і мяшчанам перайсці ў купецкае саслоўе. Цэнтрамі ўнутранага гандлю працягвалі быць гарады і буйныя мястэчкі. У канцы XVIII – першай палове XIX ст. у Беларусі працягвалі адыгрываць важную ролю кірмашы, але нават буйнейшыя з іх уступалі па сваіх гандлёвых абарачэннях украінскім і рускім.

Аб'ём унутранага гандлю ў вывучаемы перыяд значна ўступаў аб'ёму знешняга (вывазнога), які ў асноўным насіў транзітны характар.

Паказчыкам слабасці купецкага капіталу ў Беларусі з'яўлялася памяншэнне колькасці гандлюючых і невялікая ўдзельная вага сярод тых, хто займаўся гандлем, купцоў першай і другой гільдый. Слабае развіццё гандлю і фінансаў стрымлівала рост гарадоў і мястэчак, якія на працягу

вывучаемага перыяду заставаліся рамесна-гандлёвымі цэнтрамі невялікіх эканамічных раёнаў [8].

Асаблівасцю сацыяльна-эканамічнага развіцця гарадоў Беларусі ў другой палове XVIII ст. быў стрымліваючы ўплыў фальваркова-паншчыннай сістэмы не толькі на прыватнаўласніцкія, але і на каралеўскія гарады. Гэта прадвызначыла і той факт, што колькасць гарадоў у Беларусі за вывучаемы перыяд не павялічылася. У другой палове XVIII – першай палове XIX ст. тут налічвалася значная колькасць мястэчак, большасць з якіх былі невялікімі, у некалькі дзясяткаў двароў вёскамі, але адрозніваліся ад апошніх правам правядзення невялічкіх кірмашоў.

Стрымлівала эканамічнае развіццё гарадоў наяўнасць у іх зямельнай уласнасці феадалаў, павелічэнне падаткаў і рознага роду набораў. Гнёт феадальных падаткаў і павіннасцей клаўся не толькі на бяднейшую частку гараджан, але і на буржуазію, якая толькі нараджалася.

Нізкі ўзровень развіцця гарадской прамысловасці абумовіў той факт, што даволі значная частка насельніцтва гарадоў і мястэчак Беларусі ў вывучаемы перыяд займалася сельскай гаспадаркай, што сведчыла аб незавершанасці працэсу аддзялення прамысловасці ад земляробства. Слабасць развіцця прамысловасці ў многіх гарадах і мястэчках Беларусі вымушала частку гараджан у пошуках сродкаў для існавання займацца рамізніцтвам, будаўнічымі і землянымі работамі, нарыхтоўкай і сплавам лесу, выгрузкай і пагрузкай суднаў.

Капіталістычныя адносіны ўсё ж раней і больш інтэнсіўней, чым у сельскай гаспадарцы, пранікалі ў эканамічнае жыццё гарадоў і ўплывалі на рост колькасці гарадскога насельніцтва і змяненне сацыяльнага складу.

Аднак яны стрымліваліся развіццём фальваркова-паншчыннай сістэмы гаспадаркі, што з'яўлялася сутнасцю крызісу феадалізму ў Беларусі ў канцы 50-х гг. XIX ст. Эканамічнае развіццё зрабіла ўплыў на характар і інтэнсіўнасць сацыяльных працэсаў.

Выразнай сацыяльнай тэндэнцыяй у беларускай вёсцы быў складаны і не заўсёды паступальны працэс маёмаснай дыферэнцыяцыі дваран і сялян. Эвалюцыя гэтых феадальных класаў яшчэ не насіла капіталістычнага характару. Аднак рост катэгорыі дзяржаўных сялян за кошт памешчыцкіх і свабодных сведчылі не толькі аб распаўсюджванні прыгонніцтва ўшыр, але і аб элементах разлажэння феадальнага ладу. Аб гэтым сведчылі і збядненне, і абеззямельванне дзяржаўных і памешчыцкіх сялян, а таксама выдзяленне з іх невялікай па колькасці групы – заможных сялян. Гэтыя працэсы штучна стрымліваліся самімі памешчыкамі і царскім самадзяржаўем, якое стаяла на абароне іх інтарэсаў.

Дыферэнцыяцыя сярод дваран ішла больш інтэнсіўна. У вывучаемы перыяд частка дваран пачынае займацца прадпрымальніцтвам, частка папаўняе рады арміі, чыноўніцтва і інтэлігенцыі. Значная праслойка збяднелай шляхты была пазбаўлена правоў дваранства і папоўніла рады дэкласаваных элементаў, якія жылі за кошт выпадковых заробкаў, а часам і за кошт заняткаў сельскай гаспадаркай, рамяством і дробным гандлем. К канцу даследуемага перыяду колькасць дваранства скарачаецца больш чым у 3 разы. Рост колькасці дэкласаваных элементаў вёў да паўперызацыі насельніцтва, не ствараючы пакуль яшчэ рынку вольнанаёмнай працы.

Вельмі высокімі ў вывучаемы час былі тэмпы росту гарадскога насельніцтва. З канца XVIII ст. да 1861 г. колькасць гараджан павялічылася ў 4 разы, ішоў, хоць і вельмі марудна, працэс павелічэння колькасці буйных па тым часе гарадоў з насельніцтвам у 10 тыс. чал. і больш.

Аднак усе гэтыя колькасныя змены не сведчылі аб узроўні эканамічнага развіцця гарадоў, паколькі асноўнай крыніцай папаўнення насельніцтва гарадоў і мястэчак у канцы XVIII – першай палове XIX ст. было гвалтоўнае ссяленне сюды яўрэяў з сельскай мясцовасці.

У гарадах Беларусі таксама назіралася дыферэнцыяцыя гараджан на заможныя вярхі, якія складалі меншасць гарадскіх жыхароў, і немаёмных гараджан, галоўным чынам мяшчан, што былі асноўнай сацыяльнай групай беларускіх гарадоў. Маёмаснае расслаенне ў асяроддзі мяшчанства, з'яўленне сацыяльных груп, нехарактэрных феадальнаму гораду, сведчылі аб уплыве новага, капіталістычнага ўкладу, які развіваўся ў нетрах феадалізму, на сацыяльную структуру гарадскога насельніцтва.

Складаныя гістарычныя ўмовы развіцця Беларусі абумовілі шматнацыянальны склад яе насельніцтва.

Праблема генезісу буржуазіі і пралетарыяту з'яўляецца ключавой у даследаванні сацыяльных працэсаў у перыяд позняга феадалізму ў Беларусі. У вывучаемы перыяд можна выдзеліць і характарызаваць толькі першую фазу працэсу фарміравання буржуазіі і пралетарыяту, дакладней, – фарміравання передумоў складвання гэтых класаў.

Буржуазія, якая зараджалася, характарызавалася ў даследуемы перыяд тым, што ў большасці гэта былі прадстаўнікі гандлёва-ліхвярскага капіталу, часцей за ўсё яўрэйскай нацыянальнасці. Сацыяльнай базай фарміравання буржуазіі і пралетарыяту ў Беларусі былі дробныя і вельмі дробныя ўласнікі як горада, так і вёскі, звязаныя з рамяством і рознічным гандлем. Роля і значэнне дробнай буржуазіі захаваліся ў Беларусі не толькі ў дарэформенны перыяд, але і пасля адмены прыгоннага права.

Характэрнай асаблівасцю буржуазіі, якая зараджалася ў Беларусі, была яе нешматлікасць і залежнасць (эканамічная, часам і юрыдычная) ад дваранства.

Што да эвалюцыі сялянства Беларусі, то з поўным правам можна сказаць: у даследуемы перыяд яно было дастаткова маналітным класам феадаль-

нага грамадства і толькі буржуазная аграрная рэформа 1861 г. магла пераўтварыць неаднаЗначны працэс маёмаснай дыферэнцыяцыі ў сацыяльную.

Адсутнасць буйных капіталаў і фінансавай падтрымкі з боку ўрада стрымлівалі працэс фарміравання буржуазіі і пралетарыяту. Колькасць рабочых на мануфактурах і ў рамесных майстэрнях складала ў канцы вывучаемага перыяду каля 6 тыс. чалавек, альбо 0,19 % ад колькасці ўсяго насельніцтва. Буржуазная праслойка была яшчэ меншай – некалькі дзесяткаў чалавек.

Такім чынам, позні пачатак зараджэння капіталізму ў эканоміцы прадвызначыў і маруднае фарміраванне новай сацыяльнай структуры, складанне перадумоў фарміравання новых класаў. Пераходны перыяд у эканоміцы вызначыў і выключна неаднастайны сацыяльны склад насельніцтва. Другая палова XVIII – першая палова XIX ст. з'яўляліся пераходным перыядам, калі зараджаліся першыя парасткі новага, капіталістычнага грамадства.

У разглядаемы перыяд працягваўся працэс фарміравання беларускай нацыі як сялянскай у сваёй аснове. Адмоўнае ўздзеянне на працэс фарміравання беларускай нацыі аказвалі слабасць нацыянальнай буржуазіі, беднасць і непісьменнасць большасці беларусаў, рэлігійны раскол і антыбеларуская накіраванасць праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла, школы, друку, дзяржаўных устаноў, якія адмаўлялі існаванне беларускага этнасу і ўсіх беларусаў лічылі альбо рускімі, альбо палякамі. У працэсе фарміравання беларускай нацыі складванне нацыянальнай літаратурнай мовы цалкам не завяршылася. Нягледзячы на некаторы рост нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, і гэты працэс таксама поўнасцю не завяршыўся. Развіццё беларускай нацыі працягвалася яшчэ і ў пачатку XX ст.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Маркс, К. Сочинения : в 30 т. / К. Маркс, Ф. Энгельс. – 2-е изд. – М. : Политиздат, 1960. – Т. 16. – С. 164.
2. Белоруссия в эпоху феодализма : сб. документов и материалов : в 4 т. – Т. 3: Воссоединение Белоруссии с Россией и ее экономическое развитие в конце XVIII – первой половине XIX века (1772–1860) / сост.: В. В. Чепко, В. В. Шатилло. – Минск: Изд-во Акад. наук БССР, 1961. – Т. 3. – С. 35–36, 68–69; ПСЗРИ. – Т. 19. – С. 753–754; Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / рэдкал. : І. М. Ігнаценка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 1 : Першабытны лад на тэрыторыі Беларусі: Эпоха феадалізму / рэдкал.: К. І. Шабуня (гал. рэд.) [і інш.]. – 1972. – С. 449, НГАБ у Гродне. – Ф. 1465. Воп. 1. Спр. 19. Л. 29–30.
3. ПСЗ. – Т. 19. – С. 573; НГАБ, Ф. 295. Воп. 1. Спр. 130. Л. 265.
4. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 704, 763, 775 і інш.
5. Маркс, К. Сочинения : в 30 т. / К. Маркс, Ф. Энгельс. – 2-е изд. – М. : Политиздат, 1960. – Т. 3. – С. 23.
6. Люты, А. М. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя : манаграфія / А. М. Люты. – Мінск : БДПУ, 2004. – С. 250–307.
7. Там жа.
8. Там жа. – С. 312–319.




*УДК 37*

# ВОЛОНТЕРСТВО КАК ФАКТОР ПЕДАГОГИЧЕСКОГО ПРОФЕССИОНАЛИЗМА

# VOLUNTEERING AS A FACTOR OF PEDAGOGICAL PROFESSIONALISM

*Д. И. Наумов, Т. Д. Шкуратова*

*D. Naumov, T. Shkuratova*

В статье анализируется роль волонтерского движения в формировании и развитии педагогического профессионализма студенческой молодежи.

The article analyzes the role of volunteer's movement in the formation and the development of pedagogical professionalism of students.

Профессиональная подготовка специалиста в области образования нацелена как на формирование комплекса академических компетенций, позволяющих ему адекватно и эффективно осуществлять педагогические функции, так и на развитие социально-личностных компетенций, функционально нацеленных на более широкую предметную область. В идеально-типическом аспекте их можно рассматривать в качестве фактора, обеспечивающего достижение высокого уровня интеллектуального и нравственного развития личности специалиста, его эффективную адаптацию к новым ситуациям в социальной практике и профессиональной деятельности. Однако сложная природа социально-личностных компетенций не предполагает жесткую формализацию и алгоритмизацию процесса их формирования и развития. В первую очередь это касается педагогической практики, которая требует осознанной и аксиологически мотивированной деятельности. Данный аспект актуализирует обращение к волонтерству как фактору, который конструирует пространство просоциальной активности личности и имплицитно обеспечивает успешность профессиональной социализации.

В современной социальной практике понятие «волонтерство» обычно используется для обозначения особого вида многоаспектной деятельности, нацеленной на решение актуальных проблем как отдельных социальных групп и институтов, так и общества в целом. Волонтерская деятельность осуществляется индивидами на принципах добровольности, активизма и альтруизма как в рамках институционализированных структур (общественные объединения, политические партии, национально-культурные организации и т. д.), так и неформализованных гражданских инициатив. Широкое распространение в современном мире волонтерских инициатив и практик, их безусловная гуманистическая направленность и эффективность в плане реализации общих целей и защиты общих интересов, элиминирования групповых барьеров и дискриминационных установок обусловили внима-